

ДОЎГІ ШЛЯХ ДАДОМУ
5



ЯК ЗДЫМАЛІ «БЕЛЫЯ РОСЫ»
13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

1 ЛІПЕНЯ 2023 г. СУБОТА № 125 (30005)

# Наш галоўны дзень!

## ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!

3 ліпеня наша краіна адзначае Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі).

Гэтае свята — даніна пакаленням беларусаў, якія на працягу стагоддзяў адстойвалі права жыць на роднай зямлі і самастойна вызначаць уласны лёс. Гэтае свята захоўвае памяць аб беспрыкладным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дэманструе гістарычную сталасць, нацыянальную годнасць і цвёрдую волю спадкаемцаў народа-пераможцы ўмацоўваць сваю дзяржаўнасць.

Выбраўшы шлях пераемнага развіцця, мы захавалі і прымножылі найлепшыя дасягненні савецкага перыяду, асвойваем сучасныя высокатэхналагічныя галіны эканомікі. Нягледзячы на беспрэцэдэнтныя выклікі часу, забяспечваем сацыяльныя гарантыі і магчымасці для самарэалізацыі кожнаму грамадзяніну.

Сфарміраваны за гады незалежнасці духоўны, маральны, інтэлектуальны, эканамічны базіс дазваляе нам з упэўненасцю глядзець у будучыню. А народнае адзінства, добрасумленная праца і беражлівыя адносіны да сваёй зямлі з'яўляюцца залогам дасягнення самых запаветных мэт.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця, міру і дабрабыту.

Са святам, дарагія сябры! З Днём Незалежнасці!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «НАША ШТОДЗЁННАЯ ПРАЦА — І ЁСЦЬ ЦАНА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ»



Фота БелТА.

### Выступленне Аляксандра Лукашэнкі на ўрачыстым сходзе ў гонар Дня Незалежнасці

Дарагія суайчыннікі!

Паважаныя ветэраны, сябры!

Віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, вялікім святам нашай краіны, сугучным з Днём Перамогі.

У Год міру і стваральнай працы гэты дзень набывае асаблівы сэнс. Да сваёй незалежнасці беларусы ішлі праз войны, самаахвярныя подзвігі і вялізную працу.

Пакаленне, якое падарыла Вялікую Перамогу, падарыла нам свабоду і мір цаной сваіх жыццяў. Мільёнаў жыццяў.

Мы будзем гаварыць і памятаць пра гэта заўсёды і перадаваць гэтыя веды новаму народжанаму на нашай зямлі грамадзяніну. Бо 3 ліпеня, у дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, змучаныя няволяй, дзікімі катаваннямі, стратамі родных і блізкіх, беларусы вярнуліся да жыцця.

Няма і не можа быць іншага сэнсу ў гэтага свята. Няма і не можа быць іншай даты, як бы ні марылі нашчадкі нацыстаў там і іх памагатыя тут.

Для нас, сапраўдных беларусаў, Дзень Незалежнасці — гэта дзень, які набліжае Перамогу савецкага народа над фашысцкай Нямеччынай.

Дарагія ветэраны вайны і працы!

Мы, усе, хто нарадзіўся ў гады вайны і пасля, у неаплатным даўгу перад вамі. Нам пашанцавала быць дзецьмі і ўнукамі такіх мужных і валявых людзей, як вы, — сапраўдных патрыётаў.

Нам пашанцавала расці і выхоўвацца на прыкладзе ваенных і працоўных подзвігаў вашага гераічнага пакалення. Пакалення, якое навучыла нас трымаць удар, жыць па сумленні і па справядлівасці.

Дай Бог вам здароўя і бадзёрасці! Дай Бог нам як мага даўжэй мець магчымасць гаварыць вам словы бясконцай падзякі, віншаваць вас з гэтым вялікім святам, якое вы нам падарылі.

*(Апладысменты.)*

Вы змагаліся на палях ваенных бітваў. Ваша Перамога на многія дзесяцігоддзі наперад забяспечыла мір краінам і кантынентам. Але гэты свет вычарпаў свой запас трываласці. Сёння наш час выканаць сваю гістарычную місію. Цяпер мы б'ёмся за гэты мір. Як бачыце, б'ёмся на інфармацыйным, эканамічным, палітычным франтах.

Так, гэтую вайну не ўсе бачаць і не ўсе ўсведамляюць. Так, на ёй не рвуцца снарады, не свішчуць кулі. Але ўсё гэтак жа нас жадаюць паставіць на калені і знішчыць.

Чаму ж Захад зноў лепіць з нас ворага?

Нас баяцца. Не ў тым сэнсе, што мы «агрэсары» і збіраемся на кагосьці нападаць, занявольваць. Мы для іх небяспечныя аўтарытэтам, самастойнасцю і сілай беларускай дзяржавы. У рэшце рэшт, і гэта самае галоўнае, — сваім прыкладам.

Прыкладам адсутнасці прорвы паміж багатымі і беднымі, прыкладам сацыяльнай абароненасці ўсіх грамадзян, прыкладам здаровага грамадства і традыцыйных каштоўнасцяў. І многімі іншымі дасягненнямі беларускага народа, якія імпануюць простым еўрапейцам і амерыканцам.

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X




З ДНЁМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ!